**КАМУ ЎСМІХАЮЦЦА КОСКІ І ДУЖКІ?**

Канцавая Г.М.

Школьнае жыццё заўсёды багатае на сюрпрызы і нечаканасці. Таму не было нічога дзіўнага ў надзвычай ажыўленым абмеркаванні студэнтамі нейкіх цікавых падзей, сведкамі якіх яны сталі падчас педагагічнай практыкі. Дзіўным быў сэнс гэтых падзей – па словах студэнтаў, у школьнікаў з’явілася адметнае таямнічае пісьмо, пабудаванае з косак, дужак, кропак і іншых знакаў пунктуацыі. Гэтай шыфраванай мовай яны ўпрыгожвалі лісты адзін да другога, на ёй пісалі запіскі і г.д. Сапраўды, з’ява незвычайная. Такое адбываецца не кожны дзень і можа моцна зацікавіць настаўніка, асабліва настаўніка славеснасці.

Паспрабаваўшы разабрацца, у чым тут справа, гляджу на гэтыя «таямнічыя пісьмёны», адразу пазнаю іх і ўсё разумею. Гэта ж эматыконы – графічныя сродкі выражэння эмоцый у камп’ютэрных тэлекамунікацыях, адзін з цікавых феноменаў сучаснай сеткавай культуры.

Камунікацыі з дапамогай камп’ютэрных сетак, пазбаўленыя многіх кампанентаў непасрэдных міжасабовых зносін (асабліва на ранніх этапах развіцця тэлекамунікацый, калі было немагчыма перадаваць акустычную і графічную інфармацыю), абмежаваныя тэхнічнымі магчымасцямі канкрэтных камунікацыйных сістэм, павінны былі выпрацаваць асаблівыя кампенсатарныя сродкі для таго, каб заставацца паўнацэннымі зносінамі паміж людзьмі.

Адной з праблем пры зносінах з дапамогай электроннай пошты з’яўляецца неабходнасць максімальна трапна і каратка данесці да адрасата эмоцыі, што ўкладваюцца ў ліст. З гэтай мэтай былі прыдуманы сімвалы для абазначэння эмацыянальнага стану чалавека і прыдання выказванням экспрэсіўнай афарбоўкі, якія так і называюцца – **«эматыконы» (emoticon)**, альбо **«ўсмешкі» (smiley)**. На жаль, аўтар гэтай цудоўнай ідэі дагэтуль застаецца невядомым.

Эматыконы ствараюцца з дапамогай клавіятурнага набору розных знакаў пунктуацыі і чытаюцца пры мысленным павароце тэксту на 90 градусаў па гадзіннікавай стрэлцы.

Класічная і самая простая «ўсмешка» створана двукроп’ем, дэфісам і правай круглай дужкай. Каб «убачыць» яе, неабходна павярнуць тэкст на вугал, роўны $\pi/2$, альбо нахіліць галаву:

**:-)**

Адразу перад намі з’яўляецца забаўны твар з усмешкай, які можа азначаць добры, жартаўлівы настрой аўтара альбо тое, што да тэксту, які папярэднічае дадзенай выяве, нельга адносіцца сур’ёзна. Напрыклад: Віншую з выхадам Вашай кнігі, спадзяюся хутка ўбачыць збор твораў :-).

Калі ў гэтым эматыконе замяніць правую круглую дужку на левую, можна атрымаць выяву зусім іншага выразу твару:

**:-(**

Репозиторий БрГУ

Гэты эматыкон перадае настрой смутку, разладжаныя пачуцці. Напрыклад: На жаль, мы не здолелі сустрэцца, магчыма спаткаемсяпазней :-(

Ён жа можа выражаць настрой незадаволенасці. Напрыклад: Нагадваю Вам, што крайні тэрмін здачы рэфератаў – заўтра ў 15.00 :-(

Калі аўтар у жартоўнае пасланне жадае ўставіць важную заўвагу альбо звярнуць увагу на сур'ёзнасць адносін да «фантастычнай ідэі», ён можа выкарыстаць эматыкон, які выражае эмацыянальную аддаленасць, індыферэнтнасць:

**:-I**

Да найбольш распаўсюджаных эматыконаў можна аднесці:

| | |
|---|---|
| **;-)** | Усмешка з падморгваннем |
| **:-/** | Скептычнае выражэнне |
| **:-()** | Крайняе здзіўленне |
| **:*** | Пацалунак |
| **:->** | Выражэнне сарказму |
| **:-** | Мужчына |
| **>-** | Жанчына |

Нельга абысці ўвагай і суперусмешкі, якія складаюцца з вялікай колькасці розных знакаў пунктуацыі. Напрыклад: **@%V)X** (чалавек, які глядзеў на экран усю ноч, павярнуў нос у другі бок і надзеў гальштук).

Існуюць многія дзесяткі эматыконаў. Знаёмства з імі з'яўляецца не толькі неабходнай умовай для эфектыўных сеткавых зносін, але можа аказацца вельмі карысным і ў іншых галінай чалавечай дзейнасці.

Сёння, калі зносіны праз Інтэрнет уключаюць і прамую маўленчую сувязь, і відэаканферэнцыі, ды і сама электронная пошта дазваляе абменьвацца не толькі тэкставымі паведамленнямі, але і мультымедыйнымі файламі, эматыконы больш не з'яўляюцца неабходным інструментам для выражэння эмацыянальнага стану.

Аднак яны не толькі захаваліся, але і паспяхова развіваюцца, нават не толькі ў самой Сетцы. Эматыконы шырока ўжываюцца ў папяровых камп'ютэрных выданнях і традыцыйным ліставанні людзей, што маюць непасрэднае дачыненне да інфармацыйных тэхналогій. Яны ўжо сустракаюцца ў папулярнай літаратуры, якая не мае адносін да камп'ютэрнай тэматыкі.

Зусім зразумела, што калі-небудзь яны павінны былі з'явіцца і ў школьным жыцці. Відавочна, што гэтыя займальныя сімвалічныя адлюстраванні чалавечых твараў змогуць пры выпадку многае распавесці педагогу, які іх разумее.

Репозиторий БрГУ